Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №113 (28477)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Без чаго не плывуць караблі

СТАР. 13



Сакрэты старой хаты

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена БОГДАН, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя:**

*«Тэхналогія электроннага рэцэпта, якая ўкараняецца цяпер у Беларусі, ляжа ў аснову для стварэння адзінай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя. Для кожнага чалавека будзе персанальна распрацавана медыцынская электронная карта, у кожнага пацыента будзе свой электронны медыцынскі кабінет. Ужо сёння многія паліклінікі, мінскія і не толькі, вядуць электронныя медыцынскія карты. Гэта дазваляе кансультаваць пацыентаў у аддаленым рэжыме, наладжваць з імі больш эфектыўны дыялог».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8840 | ▲ |
| Еўра | 2,1071 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0724 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Усё па навуцы



Малодшыя навуковыя супрацоўнікі Цэнтральнага батанічнага саду Яўгенія ЛЕГАРАВА і Яна АПАСАВА за мікрачаранкаваннем высокарослых буякоў у новазбудаванай лабараторыі мікраканальнага размнажэння раслін. Праца батанікаў ручная і праходзіць у стэрыльных умовах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Людзі і лёсы

## І МЕЖ НЯМА ДЛЯ ДУШЫ

### Анатоль Галушка стварае свае карціны з дапамогай пэндзля, які заціскае ў зубах



**У Брэсце працягваецца персанальная выстаўка мастака з вёскі Магіліцы Івацэвіцкага раёна Анатоля ГАЛУШКІ пад назвай «Пішу зямлі тваёй красу». Экспазіцыю склалі 60 работ аўтара, у асноўным пейзажы па матывах родных мясцін, ёсць і нацюрморты з кветкамі. Гэтая выстаўка адразу заварожвае сонечным святлом, мноствам жоўтых і аранжавых фарбаў, адчуваннем бясконцасці і ўрачыстасці. Спакойнае хараство льецца ў душу ад карцін чалавека, які амаль нерухомы. Нават уявіць сабе цяжка, што работы напісаны не рукамі.**

На адкрыцці Анатоль прызнаўся, што гэтую выстаўку рыхтаваў цэлы год. Вернісаж далёка не першы ў біяграфіі мастака. Яго жыццесцвярджальныя карціны бачылі жыхары Бярозы, Белаазёрска, Пружан, Мінска. Самая першая выстаўка адбылася ў Мінску. І не проста ў сталіцы — у фае Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Пасля гэтага было шмат увагі, падарункаў, слоў падтрымкі, што, несумненна, дадало натхнення ў далейшай творчасці.

Член сусветнай арганізацыі мастакоў-інвалідаў стварае карціны з дапамогай пэндзля, які заціскае ў зубах. Лёс вельмі жорстка абышоўся з гэтым чалавекам. У сямнаццаць гадоў, толькі стаўшы курсантам мараходнага вучылішча, ён атрымаў траўму і назаўсёды аказаўся прыкаваным да ложка. Праз шэсць гадоў памёр бацька — не змог перанесці пакут сына. Анёлам-ахоўнікам Анатоля, яго рукамі і нагамі стала мама Лідзія Іванаўна.

СТАР. 3

■ Ідэя +

## «ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ МОЖНА З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ»

### Рэгіянальны кіраўнік Бізнес-школы ІПМ у Магілёве Ганна Перунова пра тое, чаго не хапае прадпрымальным людзям для поспеху



**Бізнес-школа ІПМ — гэта, па сутнасці, цэнтр павышэння кваліфікацыі для бізнесменаў, які існуе ў Беларусі ўжо 20 гадоў. А два гады таму яго філіялы пачалі з'яўляцца і ў абласных цэнтрах. Не трэба быць прадпрымальнікам, каб разумець: існаваць у свеце рынкавых адносін стыхійна нельга. Сёння, калі ўсё так імкліва мяняецца, удасканальваецца, ускладняецца, нават дыплом з адзнакай прэстыжнага эканамічнага ўніверсітэта не гарантуе, што ведаў хопіць на ўсё астатняе жыццё. Пра тое, наколькі прадпрымальным людзям цікавыя механізмы паспяховага вядзення бізнесу, хто іх у сябе ўкараняе і як развіць у сабе талент прадпрымальніка, гутарым з рэгіянальным кіраўніком магілёўскай Бізнес-школы ІПМ Ганнай ПЕРУНОВАЙ.**

***— Ганна, і ўсё ж такі навошта спатрэбілася адкрываць філіялы ў абласных цэнтрах? Няўжо наш айчынны бізнес так актывізаваўся, што цэнтральны офіс у Мінску не спраўляецца ўсіх адукоўваць?***

— Мы проста паклапаціліся пра тое, каб якасная адукацыя была больш даступнай у рэгіёнах. Гэта дазваляе вучыцца без адрыву ад працоўнага працэсу і эканоміць час і грошы на камандзіроўках. Я не скажу, што ў нас вельмі шмат вучняў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!